| Гродзенскае абласное аддзяленне грамадскага аб’яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі»<br><br>230023 г.Гродна вул.Савецкая, д.31, к.39<br>тэл-факс: (8-0152) 60-20-22 | | Гродненское областное отделение общественного объединения «Союз писателей Беларуси»<br><br>230023 г.Гродно, ул.Советская, д.31, к.39<br>тел-факс: (8-0152) 60-20-22 |
|---|---|---|


# Справаздача

## аб дзейнасці Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі за 2017 год

За 2017 год Гродзенскае абласное аддзяленне папоўнілася чатырма новымі сябрамі, імі сталі: літаратуразнаўца, крытык Руслан Казлоўскі, украінскі паэт Рыгор Гармаш, маладыя паэтэсы Наталля Цвірко і Вікторыя Смолка.

У гэтым годзе гродзенскія аўтары выдалі 13 кніг, у першым паўгоддзя –2, у другім – 11. З іх 7 выйшлі ў дзяржаўных выдавецтвах, і 6 – у прыватных. Адбылося шмат мерапрыемстваў па розных накірунках дзейнасці, пра якія сведчыць ніжэй прыведзеная табліца. Сярод іх неабходна вылучыць новы праект аддзялення – рэспубліканскі семінар “Створым падручнік разам”, у якім ішла гаворка пра стварэнне літаратурнага дапаможніка для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ на рэгіянальным матэрыяле. Праект набыў вялікую зацікаўленасць і дакладныя рысы. Пасля абмеркавання на семінары ўжо створаны склад экспертнай камісіі для адбору матэрыялаў, спіс пісьменнікаў, якія могуць прэтэндаваць на ўключэнне ў дапаможнік, сабраны амаль усе іх творы.

У новым фармаце прайшло мерапрыемства, прысвечанае Элізе Ажэшка. Сёлета гэта быў летні канцэрт-баль, які адрадзіў традыцыю і з’явіўся адкрыццём Гродзенскіх сезонаў Элізы Ажэшкі. Як сведчыць гісторыя, пісьменнікі ніколі не былі лішнімі на такіх імпрэзах. Вось і тут гродзенскія паэты прадсталі перад прысутнымі з творамі, прысвечанымі пісьменніцы і нашаму ўнікальнаму гораду.

Парадавала тое, што традыцыйны праект да Дня Перамогі “Пад мірным небам Беларусі” набыў больш шырокі маштаб: адбыўся не толькі тур па трох раёнах вобласці, але і мерапрыемствы ў розных установах нашага горада.

У першым паўгоддзі мы завязалі творчыя сувязі з польскімі пісьменнікамі і разам з імі стварылі анталогію паэзіі “Масты: Гродна – Варшава. Варшава – Гродна”, у якой змешчаны творы дзесяці гродзенскіх і дзесяці польскіх аўтараў у арыгінале і перакладах. Прэзентацыя Анталогіі адбылася ў Варшаве падчас Сусветнага фестывалю славянскай паэзіі, арганізаваным ЮНЕСКА, Беларускі бок прадстаўлялі Ала Клемянок і Людміла Кебіч. Прэзентацыя ў Гродна прызначана на май месяц. У другім паўгоддзі быў здзейснены яшчэ адзін літаратурны праект, на гэты раз з пісьменнікамі

Растоўскай вобласці Расіі. На радзіме А.П. Чэхава ў кастрычніку прайшоў фестываль паэзіі і паэтычных перакладаў, на якім пабываў Алесь Хітрун з Ліды. Ён атрымаў другое месца і прывёз зборнікі з перакладамі нашых аўтараў: І.Войтка, В. Семянякі, В. Смолка, Н. Цвірко, Л. Кебіч. У наступным годзе таксама адбудзецца такі фэст, на які запрашаюць маладых перакладчыкаў ад 15 да 35 гадоў.

Напрыканцы года мы былі запрошаны да ўдзелу яшчэ ў двух калектыўных зборніках – адзін на рускай мове "На одном языке"(Разанская вобласць), куды мы адабралі творы васьмі нашых паэтаў, і зборнік паэзіі на беларускай мове "Беларусь – мая Айчына", які плануецца выпусціць у Мінску на наступны год.

2017 год быў багаты на семінары, круглыя сталы, канферэнцыі і тэматычныя чытанні, у якіх пісьменнікі аддзялення бралі ўдзел і якія былі прысвечаныя 135-годдзю Янкі Купалы і Якуба Коласа, 500-годдзю беларускага друкавання і дзейнасці Францыска Скарыны. Бралі ўдзел пісьменнікі і ў двух абласных фестывалях кнігі, першы адбыўся ў г. Свіслач, другі – у Гродна. Ладзілі сустрэчы чытачоў не толькі з гродзенскімі творцамі, але і паэтамі з Мінску – Лізаветы Палеес, Андрэя Скарынкіна, Віктара Шніпа.

Працягваў працу створаны тры гады таму грамадскі дыскусійны клуб "Словадром", адбылося 9 пасяджэнняў па наступных тэмах:

- ✓ "Пераемнасць у мастацтве" – 31.01.17.
- ✓ "Чыстае слова" – 28.02.17.
- ✓ "Паэзія – гэта… (да Сусветнага дня паэзіі) – 28.03.17.
- ✓ "Як жывеш, кніга?" (да сусветнага дня кнігі; у межах навукова-практычнага семінару "Сучасная літаратурная адукацыя: рэгіянальны аспект", да 500-годдзя беларускага першадруку). – 26.04.17.
- ✓ "Гістарычная праўда: шлях да сябе" – 30.05.17.
- ✓ Музычна-паэтычная вечарына "Залатая восень – залаты ўзрост" – 26.09.17.
- ✓ "Мой ідэал" – 31.10.17.
- ✓ "Мой сюжэт: якіх сюжэтаў не хапае ў сучаснай літаратуры" – 28.11.17.
- ✓ "Мой выхад" – выніковае пасяджэнне ў форме прадсвяточнага вечара паэзіі – 19.12.17.

Раз у два месяцы працягвала дзейнасць Гродзенская грамадская літаратурная школа. Адбыліся заняткі па наступных тэмах:

- 17 лютага –“Эстэтычнае ў мастацкай літаратуры”. Праводзіў кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы, літаратуразнаўца, крытык, фалькларыст Р.К. Казлоўскі.
- 18 красавіка – “Мастацкія асаблівасці жанру лірычнай мініяцюры ў творчасці беларускіх пісьменнікаў 20-га стагоддзя.” Праводзіў Р.К. Казлоўскі.
- 18 кастрычніка – “Праблемы стылістыкі ў творах сучасных беларускіх пісьменнікаў.” Праводзіў мастацтвазнаўца і літаратуразнаўца, прафесарА.М. Пяткевіч
- 13 снежня – “Асновы вершаскладання і іх праблематыка ў творах сучасных беларускіх аўтараў”. Праводзілі члены СПБ, паэты, філолагі Л.А. Кебіч і Д.М. Радзівончык.

У мінулым годзе адбыліся творчыя вечары з прэзентацыямі кніг пісьменнікаў аддзялення: Галіны Богдан, Ганны Скаржынскай, Пятра Сямінскага, Людмілы Кебіч, А. Сазанчука, В. Кудлачова, І. Фамянковай. А таксама прэзентацыя літаратурнага альманаха №5 “На Нёманскай хвалі”.

За год дадзена 37 кансультацый пачынаючым аўтарам (Д. Радзівончык, Л. Кебіч, І.Фамянкова, С.Тарасава, Р. Казлоўскі).

У параўнанні з мінулым годам пісьменнікі здзейснілі шмат выступленняў, друкаваліся ў прэсе і сацыяльным сеціве, запрашаліся на радыё і тэлебачанне. У лічбах гэта выглядае так:

**За 12 месяцаў 2017 года:**

Выступленняў – 654

Публікацый у СМІ – 321

Публікацый у інтэрнеце – 290

На радыё – 3

На тэлебачанні – 61

Упершыню мы правялі рэйтынг актыўнасці членаў аддзялення. Яго вынікі прыводзяцца ніжэй.

**Самымі значнымі мерапрыемствамі ў 2017 годзе сталі:**

1. Уручэнне Прэміі імя А.І. Дубко Гродзенскага аблвыканкама “За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва” ў намінацыі “пісьменнік года” Кошур С.А. – 18.01;

2. Паездка на XXIV Міжнародны кірмаш-выставу ў Мінск дэлегацыі пісьменнікаў, выступленне з паэтычна-музычнай праграмай “Прынёманскага краю галасы” на галоўнай пляцоўцы (Кебіч Л.А., Скаржынская-СавіцкаяГ.І., Радзівончык Д. М., Кісялёў Г.І., Клемянок А.Л., Сямінскі П.Я., Дукса М.М., Апанасевіч А.У., Шаўчэнка Л.У., Мазур Т.М.) – 10.02;

3. Сустрэча з вучнямі Мінскага адукацыйна-аздараўленчага цэнтра “Лідэр” для адораных дзяцей (Кебіч, Скаржынская-Савіцкая, Сямінскі, Шаўчэнка, Клемянок, Радзівончык, Апанасевіч) – 10.02;

4. Дзень роднай мовы ў кнігарні “Веды” ў межах рэспубліканскай акцыі (Л. Кебіч, Г. Скаржынская-Савіцкая) – 21.02;

5. Удзел Л. Кебіч у перадачы “Вокны горада” на абласным тэлебачанні з нагоды Сусветнага дня пісьменства – 03.03;

6. Удзел Р. Казлоўскага ва ўрачыстым канцэрце намінантаў на Прэзідэнцкую прэмію ў Нацыянальным тэатры оперы і балета РБ у Мінску – 06.03;

7. Купалаўскія чытанні да 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы ў ГДУ імя Янкі Купалы з удзелам выкладчыкаў, студэнтаў і пісьменнікаў Гродна (Кебіч, Сабуць, Радзівончык, Ермашкеваіч, Скаржынская-Савіцкая) – 13.03;

8. Літаратурна-музычная кампазіцыя з прэзентацыяй альманаха “На Нёманскай хвалі” №5, прысвечаная Сусветнаму дню паэзіі, у ДУ “Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры”. Удзельнікі: Л. Кебіч, Д. Радзівончык, А. Апанасевіч, Б. Ермашкевіч, Л. Шаўчэнка, А. Сабуць, С. Тарасава, У. Ягорычаў, У. Руль, Г. Кісялёў, У. Саласюк, Г. Скаржынская-Савіцкая, В. Кудлачоў, І. Фамянкова, С. Кошур, Г. Богдан, П. Сямінскі, В. Смолка, А. Руцкая, Р. Казлоўскі – 21.03;

9. Міжнароднае свята паэзіі ў аддзеле мастацтваў абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага з іншаземнымі студэнтамі горада. Чытаем беларускую паэзію на мовах свету (Кебіч Л.А., Скаржынская-Савіцкая Г.І., Радзівончык Д. М. Апанасевіч А.У.) – 28.03;

10. Рэспубліканскі навукова-практычны семінар “Сучасная літаратурная адукацыя: рэгіянальны аспект”, абласная навуковая бібліятэка імя Я. Карскага. Прысутнічалі: Л. Кебіч, Д. Радзівончык, Л. Шаўчэнка, А. Апанасевіч, Г. Скаржынская-Савіцкая, Г. Кісялёў, В. Кудлачоў, І. Фамянкова, У. Ягорычаў, П. Сямінскі, А. Сабуць, А. Руцкая, С. Тарасава, Р. Казлоўскі. – 26.04;

11. Літаратурная сустрэча з пісьменнікамі Гродзеншчыны “З родным словам і душою” ў межах тэматычнага семінара “Шчучыншчына – наш

родны край: да 500-годдзя з часу першага ўпамінання г. Шчучына”, ЦБС г. Шчучына (Л. Кебіч, Д. Радзівончык, Г. Скаржынская-Савіцкая, І. Пяшко, Н. Цвірко, А. Апанасевіч,) – 28.04;

12. Удзел у фестывалі рыторыкі і конкурсе маладых творцаў. СШ №38. Члены журы А. Сабуць, Д. Радзівончык, Г. Богдан – 13.05;
13. Тур грамадзянскай паэзіі “Пад мірным небам Беларусі” па трох раёнах вобласці: Радунь, Дзятлава, Ліда (А. Апанасевіч, Б. Ермашкевіч, Д. Радзівончык, У. Руль, Г. Скаржынская-Савіцкая, Л. Кебіч) – 17.05;
14. Абласны этап літаратурнага творчага конкурсу маладых чытальнікаў “Жывая класіка”, члены журы Д. Радзівончык, П. Сямінскі – 20.05;
15. Мерапрыемства абласной акцыі “Чытаем разам творы сучасных гродзенскіх пісьменнікаў”. Абласная бібліятэка. Прысутнічалі: Д. Радзівончык, Р. Казлоўскі, В. Кудлачоў, І. Фамянкова, Б. Ермашкевіч, У. Ягорычаў, Г. Скаржынская-Савіцкая, Л. Шаўчэнка – 25.05;
16. Рэспубліканскі фестываль рускай паэзіі “Сугучча слоў жывых” і ў яго межах конкурс маладых паэтаў “Мы народжаны для натхнення”. Д. Радзівончык, В. Орач. Брэст – 26-27.05;
17. Рэспубліканская акцыя, прысвечаная Дню абароны дзяцей у кнігарні “Веды” – сустрэча з дзіцячымі пісьменнікамі Л. Кебіч, Г. Скаржынскай-Савіцкай і Л. Шаўчэнка – 01.06;
18. Удзел пісьменнікаў аддзялення ў абласным кніжным фестывалі “Кніга і час” у г. Свіслач: навуковая канферэнцыя, заключны этап раённага конкурсу чытальнікаў, “Літаратурная гасцёўня” (А. Апанасевіч, Л. Кебіч, Д. Радзівончык, П. Сямінскі, Г. Кісялёў, Г. Скаржынская-Савіцкая, А. Руцкая, А. Паўлоўская) – 11.06;
19. Удзел пісьменнікаў аддзялення (Д. Радзівончык, Т. Мазур, Б. Ермашкевіч, П. Сямінскі, Л. Кебіч, К. Шэматовіч) у адкрыцці Гродзенскіх сезонаў Элізы Ажэшка і непасрэдна ў канцэрце-балі. – 16.06;
20. Удзел у гарадскім мерапрыемстве “Гродна – горад чытачоў” (А. Апанасевіч, Д. Радзівончык, В. Кудлачоў, І. Фамянкова, Л. Кебіч, В. Смолка, Т. Лугавая, Н. Міневіч, А. Закрэўскі). Маладзёжны цэнтр г. Гродна – 24.06;
21. Літаратурны вечар з нагоды 135-годдзя Янкі Купалы “Буду пець не за славу…” арганізаваны сумесна з клубам творчай інтэлігенцыі г. Гродна “Грані”. Прысутнічалі пісьменнікі: Л. Кебіч, Д. Радзівончык, Г. Скаржынская-Савіцкая, І. Фамянкова, В. Кудлачоў, С. Тарасава, А. Сабуць, Б. Ермашкевіч, Т. Мазур – 06.07;

22. Юбілейны вечар паэта Браніслава Ермашкевіча з нагоды яго 80-годдзя – 16.08;

23. Дзень ведаў, прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання і Дню беларускага пісьменства ў гарадскім цэнтры культуры, арганізаваным ЦБС імя А. Макаёнка – 1.09;

24. Удзел дэлегацыі пісьменнікаў у святкаванні Дня беларускага пісьменства ў Полацку (12 членаў СПБ) –2-3.09;

25. Адкрыццё выстаўкі карцін мастака Мікалая Бандарчука "Сугучнасць часу" ў удзелам паэтаў Л. Кебіч, Д. Радзівончыка, Л. Шаўчэнка ў ваенна-гістарычным музеі імя П. Баграціёна ў Ваўкавыску – 5.09;

26. Удзел пісьменнікаў А. Апанасевіча і Л. Шаўчэнка ў рэкламна-іміджавым мерапрыемстве Мастоўскай раённай бібліятэкі "Ачаг культуры і дабра", прысвечаным Дню бібліятэк Беларусі – 15.09;

27. Удзел пісьменнікаў ГАА СПБ у другім абласным фестывалі кнігі "Кніжныя скарбы Беларусі": у паэтычнай імпрэзе "Ода любаму гораду", арганізацыі сустрэчы з паэтам з Мінску, галоўным рэдактарам выдавецтва "Мастацкая літаратура" Віктарам Шніпам, арганізацыі паэтычнай пляцоўкі "Вольны мікрафон" і сустрэчы дзіцячых пісьменнікаў з чытачамі. Бралі ўдзел: Д. Радзівончык, П. Сямінскі, А. Апанасевіч, Л. Шаўчэнка, Л. Кебіч, Г. Скаржынская-Савіцкая, Б. Ермашкевіч, А. Сабуць, а таксама госці Р. Гармаш, М. Іваноўскі – 22.09;

28. Удзел пісьменнікаў аддзялення ў 12-ых Гарадзенскіх чытаннях "Ад першай сцяжыны Францыска Скарыны" ў абласной бібліятэцы: Радзівончык Д.М., Руцкая А. В.– 28.09.

29. Творчы вечар кампазітара-песенніка Валерыя Кручкова "Гродна – ты мой лёс, каханне і натхненне", у Гарадскім цэнтры культуры – 03.11;

30. Удзел старшыні аддзялення Л. Кебіч у юбілейным творчым вечары Мікалая Чаргінца, прысвечанага яго 80-годдзю. Нацыянальная бібліятэка Беларусі – 20.10;

31. Літаратурны вечар "Зямля – аснова ўсёй айчыне", Прысвечаны 135-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа. Клуб творчай інтэлігенцыі "Грані" (Кебіч Л., Радзівончык Д., Сабуць А., Тарасава С., Ермашкевіч Б., Шаўчэнка Л., Скаржынская-Савіцкая Г.) – 27.10;

32. Акцыя “Чытаем Коласа”, да 135-годдзя з дня нараджэння, ва ўніверсітэце імя Я. Купалы (Л. Кебіч, Д. Радзівончык, А. Сабуць, С. Тарасава, Р. Казлоўскі, А. Руцкая, Г.Скаржынская-Савіцкая, Б. Ермашкевіч) –09.11;

33. Сустрэча пісьменнікаў Л.Кебіч, Д. Радзівончыка, Л. Шаўчэнка з туркменскімі студэнтамі ГрДу імя Я. Купалы, офіс СПБ – 10.11;

34. Сустрэча Л. Кебіч і Г. Скаржынскай з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры школ вобласці, у абласным інстытуце развіцця адукацыі – 15.11;

**Статыстыка дзейнасці Гродзенскага абласнога аддзялення за 2017 год**

| № п/п | Прозвішча, ініцыялы | Выда-дзена кніг | Выступ-ленні аўдытор | Публіка-цыі СМІ | Інтэрнет | тэле / радыё |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Апанасевіч А.У. | – | 11+9=20 | – | 6+11=17 | 0 |
| 2 | Байкова Р.Д. | – | 0 | 1+0 | 0 | 0 |
| 3 | Богдан Г.А. | 1+0 | 16+9=25 | 25+28=53 | 26+43=69 | 0 |
| 4 | Войтка І.А. | – | 4+4=8 | 5+2=7 | 3+1=4 | 1тб.+0 |
| 5 | Данік І. М. | – | 2+0 | 2+1=3 | 0 | 0 |
| 6 | Дукса М.М. | – | 3+3=6 | 4+1=5 | 0 | 0 |
| 7 | Ермашкевіч Б.І. | – | 18+24=42 | 1+1=2 | 0+2 | 1тб.+0 |
| 8 | Казлоўскі Р.К. | – | 3+8=11 | 4+5=9 | 0+4 | 1тб.+2тб. |
| 9 | Кебіч Л.А. | – | 5<br>51+27=78 | 5+7=12 | 2+4=6 | 7тб.+4тб |
| 10 | Кісялёў Г.І. | – | 3+2=5 | 8+5=13 | 0 | 0 |
| 11 | Клемянок А.Л. | – | 6+1=7 | 10+5=15 | 10+3=13 | 2тб.+0 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 12 | Кныш Р.І. | – | 0 | 1+0 | 0+0 | 0+0 |
| 13 | Кошур С.А. | – | 10+8=18 | 6+4=10 | 4+3=7 | 2тб.+0 |
| 14 | Кудлачоў В.С. | 0+1с | 16+6=22 | 6+8=12 | – | 1тб.+0 |
| 15 | Куц В.К. | – | 0 | 0+6 | 3+0=3 | 1тб.+0 |
| 16 | Мазур Т.М. | | 7+9=16 | 5+5=10 | 0+3=3 | 0+1тб. |
| 17 | Пяшко І. Р. | – | 2+0 | 1+0 | 0 | 0 |
| 18 | Радзівонаў В.К. | 0+1 | – | 2+0 | 25+40=65 | 2тб.+0 |
| 19 | Радзівончык Д.М. | – | 27+15=42 | 4+1=5 | 12+6=22 | 1рд. 2тб.+0 |
| 20 | Руцкая А.В. | – | 9+10=19 | 3+2=5 | 3+3=6 | – |
| 21 | Руль У.В. | – | 5+3 | 8+6 | 0+0 | 0+0 |
| 22 | Рыбік Н.А. | – | 2+3=5 | 2+5=7 | 1+2=3 | 2тб.+0 |
| 23 | Сабуць А.Э. | – | 6+37=43 | 5+8=13 | 0+6=6 | 2тб.+4тб. |
| 24 | Сазанчук А. І. | – | 1+0 | 2+0 | 1+0 | 0 |
| 25 | Саласюк В.В. | – | 3+2=5 | 1+0 | 0 | 0 |
| 26 | Семяняка В.М. | – | 3+0 | 3+6=9 | 1+2=3 | 0 |
| 27 | Скаржынская Г.І. | 0+1 | 28+19=47 | 1+1=2 | 7+9=16 | 1рад. 4+4тб. |
| 28 | Сучкова Т.А. | 0+1 | 35+11=46 | 1+4=5 | – | 1тб.+0 |
| 29 | Сямінскі П.Я. | 0+2 | 18+20=38 | 6+2=8 | 22+13=35 | 2+2тб. |
| 30 | Сяроў М.І. | – | 2+8=10 | 1+2=3 | 2+2=4 | 2тб.+1р.2тб. |
| 31 | Тарасава.С.М. | – | 9+11=20 | 2+5=7 | 5=5=10 | 1тб.+0 |
| 32 | Фамянкова І.В. | 1+1+1с | 17+3=20 | 8+6=14 | 2+2=4 | 1тб.+0 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 33 | Філіповіч Т.У. | 0 | 1+1=2 | 0 | 0 | 0 |
| 34 | Цвірко Н.Л. | – | 2+2=4 | 4+5=9 | 1+2=3 | 0 |
| 35 | Цітарчук М.Р. | – | 3+1=4 | 3+1=4 | – | 0+1тб. |
| 36 | Чарапіца В.М. | 0+1 | 5+10=15 | 5+7=12 | 3+4=7 | 1тб.+1тб. |
| 37 | Чычкан Ф.У. | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| 38 | Шаўчонак М.С. | 0 | 0 | 2+0 | 0 | 0 |
| 39 | Шаўчэнка Л.У. | 0 | 22+13=35 | 1+4=5 | 1 | 0 |
| 40 | Ягорычаў У.Я. | 0+2 | 7+12=19 | 12+18=30 | – | 1тб.+1тб. |
| 41 | Якімовіч А.М. | 1 | – | – | – | – |
| 42 | Янкоўскі А.Ю. | – | 3+3=6 | 0 | 2+0 | 2тб.+0 |
| | Усяго па аддзяленню | 2+11= 13 | 360+281= 654 | 160+153= 321 | 119+168= 290 | 2р.,39тб+1р 22тб.= 3р.+61тб. |

**РЭЙТЫНГ АКТЫЎНАСЦІ ЧЛЕНАЎ АДДЗЯЛЕННЯ ЗА 2017 ГОД**

ВЫСТУПЛЕННІ:

Кебіч Л.А.(78), Скаржынская-Савіцкая Г.І.(47), Сучкова Т.А.(46,) Сабуць А.Э.(43), Радзівончык Д.М.(42), Ермашкевіч Б.І(42), Сямінскі П.Я.(38), Шаўчэнка Л.У.(35), Богдан Г.А (25), Кудлачоў В.С(22).

ПУБЛІКАЦЫІ Ў СМІ:

Богдан Г.А.(53), Ягорычаў У.Я.(30), Клемянок А.Л.(15), Фамянкова І.В.(14), Кісялёў Г.І.(13), Сабуць А.Э.(13), Кебіч Л.А.(12), Кудлачоў В.С.(12), Чарапіца В.М.(12), Мазур Т.М.(10).

ПУБЛІКАЦЫІ на сайтах:

Богдан Г.А.(69), Радзіонаў В.К.(65), Сямінскі П.Я.(35), Радзівончык Д.М.(22), Апанасевіч А.У.(17), Скаржынская-Савіцкая Г.І.(15), Клемянок А.Л. (13), Тарасава С.М. (10), Чарапіца В.М.(7), Кебіч Л.А.(6).

РАДЫЁ:

Радзівончык Д.М.(1), Скаржынская-Савіцкая Г.І.(1), Сяроў М.І.(1).

ТЭЛЕБАЧАННЕ:

Кебіч Л.А.(11), Скаржынская-Савіцкая Г.І.(8), Сабуць А.Э.(6), Сямінскі П.Я.(4), Сяроў М.І.(4), Казлоўскі Р.К.(3).

НАВЕДВАННЕ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ за 2017 год

Радзівончык Д.М.(25), Кебіч Л.А.(24), Скаржынская-Савіцкая Г.І.(17), Сабуць А.Э.(13), Казлоўскі Р. К.(10), Шаўчэнка Л.У.(10), Сямінскі П.Я.(9), Фамянкова І.В.(8), Апанасевіч У.А.(9), Ягорычаў У.Я. (7).

## Нашы недахопы і прапановы

1. У аддзяленні 43 члены, з іх актыўна працуюць толькі 14, таму складаецца ўражанне, што працуюць адны і тыя ж людзі. Дзевяць чалавек не працуюць наогул па розных прычынах, у асноўным, з-за хваробы. У нас 11 членаў ва ўзросце пасля 75 гадоў. Да 30 – 1, да 40 – 3, да 50 –3, да 60 – 9, да 70 – 10. Астатнім – за 70.

2. Вельмі цяжка ідзе падпіска на газеты і часопісы, кожы выпісвае толькі тыя выданні, дзе друкуюцца яго матэрыялы. Шмат апраўданняў тым, што ўсё можна прачытаць у Інтэрнэце, высокі кошт і малыя пенсіі.

3. Рукапісы кніг нашых пісьменнікаў знаходзяцца ў выдавецтвах па некалькі год, людзі губляюць надзею і сэнс літаратурнай творчасці.

4. Увесці ў склад рэдакцыйных калегій часопісаў “Нёман”, “Полымя”, “Маладосць”, “Белая Вежа”, газеты “ЛіМ” і інш. членаў абласных аддзяленняў. Там гадамі тыя ж самыя асобы.

5. Ёсць і іншыя парады і прапановы, але яны не для шырокага агляду.

Старшыня

Гродзенскага абласнога аддзялення

ГА “Саюз пісьменнікаў Беларусі” Л.А.Кебіч

**МЕРАПРЫЕМСТВЫ 2017 года**

**2-ое паўгоддзе (падрабязна)**

**ЛІПЕНЬ**

1. Літаратурны вечар з нагоды 135-годдзя Янкі Купалы “Буду пець не за славу…” арганізаваны сумесна з клубам творчай інтэлігенцыі г. Гродна “Грані”. Прысутнічалі пісьменнікі: Л. Кебіч, Д. Радзівончык, Г. Скаржынская-Савіцкая, І. Фамянкова, В. Кудлачоў, С. Тарасава, А. Сабуць, Б. Ермашкевіч, Т. Мазур – 06.07;

**ЖНІВЕНЬ**

1. Юбілейны вечар паэта Браніслава Ермашкевіча з нагоды яго 80-годдзя – 16.08;

**ВЕРАСЕНЬ**

1. Дзень ведаў, прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання і Дню беларускага пісьменства ў гарадскім цэнтры культуры, арганізаваным ЦБС імя А. Макаёнка – 1.09;
2. Удзел дэлегацыі пісьменнікаў у святкаванні Дня беларускага пісьменства ў Полацку (12 членаў СПБ) –2-3.09;
3. Выступленне паэта Дзмітрыя Радзівончыка ў Гродзенскім каледжы бытавога абслугоўвання насельніцтва на мерапрыемстве да 500-годдзя першадрукавання – 4.09;
4. Адкрыццё выстаўкі карцін мастака Мікалая Бандарчука “Сугучнасць часу” ў удзелам паэтаў Л. Кебіч, Д. Радзівончыка, Л. Шаўчэнка ў ваенна-гістарычным музеі імя П. Баграціёна ў Ваўкавыску – 5.09;
5. Творчая сустрэча пісьменніц Г. Скаржынскай-Савіцкай і Л. Шаўчэнка з вучнямі Гродзенскай гімназіі №10, прысвечаная 500-годдзю беларускага кнігадрукавання і Дню беларускага пісьменства – 9.09 .
6. Літаратурная імпрэза з удзелам пісьменнікаў Б. Ермашкевіча, Л. Шаўчэнка, Д. Радзівончыка ў літаратурным пакоі СШ №3 – 12.09;
7. Творчая сустрэча пісьменніцы Л. Кебіч з вучнямі 8 класа СШ №23 ў бібліятэцы №8 г. Гродна ў межах інфармацыйнага тыдня “Чытаем разам па-беларуску” – 12.09;
8. Удзел пісьменнікаў Г.Скаржынскай-Савіцкай і Л. Кебіч у мерапрыемстве дзіцячага філіяла абласной бібліятэкі “Чараўніцы мастацкага слова” ў межах інфармацыйнага тыдня “Чытаем разам па-беларуску” – 13.09;

9. Літаратурная сустрэча паэта П. Сямінскага “Душы маёй прызванне” з удзельнікамі жаночага чытацкага клуба “Сябрына” ў бібліятэцы №1 г. Гродна – 14.09;
10. Ганна Скаржынская-Савіцкая ў мерапрыемстве бібліятэкі №7 “Вытокі беларускай кнігі” прысвечанага 500-годдзю кнігадрукавання ў межах інфармацыйнага тыдня “Чытаем разам па-беларуску”– 14.09;
11. Удзел пісьменнікаў А. Апанасевіча і Л. Шаўчэнка ў рэкламна-іміджавым мерапрыемстве Мастоўскай раённай бібліятэкі “Ачаг культуры і дабра”, прысвечаным Дню бібліятэк Беларусі – 15.09;
12. Выйшла кніга А.Скаржынскай-Савіцкай “Как ребята Деда Мороза спасали” 21.09.
13. Удзел пісьменнікаў ГАА СПБ у першым абласным фестывалі кнігі ”Кніжныя скарбы Беларусі”: у паэтычнай імпрэзе “Прынёманскага краю галасы”, арганізацыі сустрэчы з паэтам з Мінску, галоўным рэдактарам выдавецтва “Мастацкая літаратура” Віктарам Шніпам, арганізацыі паэтычнай пляцоўкі “Вольны мікрафон” і сустрэчы дзіцячых пісьменнікаў з чытачамі. Бралі ўдзел: Д. Радзівончык, П. Сямінскі, А. Апанасевіч, Л. Шаўчэнка, Л. Кебіч, Г. Скаржынская-Савіцкая, Б. Ермашкевіч, А. Сабуць, а таксама госці Р. Гармаш, М. Іваноўскі – 22.09;
14. Адкрыццё сезона ў дыскусійным грамадскім клубе “Словадром”. Прысутнічалі: Д. Радзівончык, Л. Кебіч, Б. Ермашкевіч, Л. Шаўчэнка, У. Саласюк, Р. Казлоўскі, А. Сабуць – 26.09;
15. Удзел пісьменнікаў аддзялення ў 12-ых Гарадзенскіх чытаннях “Ад першай сцяжыны Францыска Скарыны” ў абласной бібліятэцы: Радзівончык Д.М., Руцкая А. В.– 28.09.

**<u>КАСТРЫЧНІК</u>**

1. Творчы вечар кампазітара-песенніка Валерыя Кручкова “Гродна – мой лёс, каханне, натхненне”, у Гарадскім цэнтры культуры. Прысутнічалі: Л. Кебіч, Д. Радзівончык, – 3.10;
2. Дэсант маладых паэтаў у Гродзенскі медыцынскі ўніверсітэт на сустрэчу са студэнтамі: 4.10 – Алена Шаламіцкая; 6.10 – Андрэй Чапялюк; 17.10 – Лізавета Наркун;
3. Сустрэча з чытачамі ў гарадской цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы пісьменнікаў В. Кудлачова і І. Фамянковай – 4.10;
4. Сустрэча пісьменніц Л. Кебіч і Г. Скаржынскай-Савіцкай са слухачамі абласных курсаў павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры (загадчыкі раённых дамоў культуры і аграгарадкоў) – 13.10;
5. Паэтычны “дэсант” дзіцячых пісьменнікаў Г. Скаржынскай-Савіцкай, Л. Шаўчэнка і Л. Кебіч у малодшыя класы СШ №3 г. Гродна – 17.10;
6. Сустрэча Л. Кебіч з удзельніцамі гродзенскага жаночага клуба “Сучасніца” – 17.10;

7. Чарговае пасяджэнне грамадскай літаратурнай школы. Прысутнічалі Г. Скаржынская-Савіцкая, Л. Кебіч, Д. Радзівончык, Т. Мазур, У. Саласюк. – 18.10;
8. Пасяджэнне Савета аддзялення – 18.10;
9. Сустрэча пісьменніц Г. Скаржынскай-Савіцкай і Т. Сучковай з вучнямі пачатковых класаў СШ №37 г. Гродна – 19.10;
10. Удзел Л. Кебіч і Л. Шаўчэнка ў юбілейнай імпрэзе кавярні "Тры свечкі", прысвечанай 3-х годдзю заснавання – 19.10;
11. Удзел старшыні аддзялення Л. Кебіч у юбілейным творчым вечары Мікалая Чаргінца, прысвечанага яго 80-годдзю. Нацыянальная бібліятэка Беларусі – 20.10;
12. Літаратурны вечар "Зямля – аснова ўсёй айчыне", Прысвечаны 135-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа. Клуб творчай інтэлігенцыі "Грані" (КебічЛ., Радзівончык Д., Сабуць А., Тарасава С., Ермашкевіч Б., Шаўчэнка Л., Скаржынская-Савіцкая Г.) – 27.10;
13. Выйшла кніга П. Сямінскага "Малінавы цмок, або Казкі нёманскіх хваль" – 27.10;
14. Чарговае пасяджэнне грамадскага дыскусійнага клуба "Словадром" у абласной бібліятэцы (Радзівончык Д., Сямінскі П.) – 31.10.

**ЛІСТАПАД**

1. Выйшла кніга вершаў Пятра Сямінскага "Век звездопада".
2. Сустрэча з паэтам з Мінску Андрэем Скарынкіным у гарадской бібліятэцы і каледжы мастацтваў(Д. Радзівончык, Г. Скаржынская-Савіцкая, Б. Ермашкевіч, У. Саласюк) – 2.11;
3. Акцыя "Чытаем Коласа", да 135-годдзя з дня нараджэння, ва ўніверсітэце імя Я. Купалы (Л. Кебіч, Д. Радзівончык, А. Сабуць, С. Тарасава, Р. Казлоўскі, А. Руцкая, Г.Скаржынская-Савіцкая, Б. Ермашкевіч) –09.11;
4. Сустрэча пісьменнікаў Л.Кебіч, Д. Радзівончыка, Л. Шаўчэнка з туркменскімі студэнтамі ГрДУ імя Я. Купалы, офіс СПБ – 10.11;
5. Сустрэча Л. Кебіч і Г. Скаржынскай з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры школ вобласці, у абласным інстытуце развіцця адукацыі – 15.11;
6. Сустрэча пісьменнікаў Л. Кебіч, Д. Радзівончыка, Г. Скаржынскай, Б. Ермашкевіча са студэнтамі 2-га курса спецыяльнасці "журналістыка", у офісе СПБ – 17.11;
7. Сустрэча Л. Кебіч, Г. Скаржынскай з вучнямі 3-4 класаў СШ №7 г. Гродна ў межах праграмы шостага школьнага дня – 18.11;
8. Чарговае пасяджэнне грамадскага дыскусійнага клуба "Словадром" у абласной бібліятэцы (Кебіч Л., Радзівончык Д., Скаржынская-Савіцкая Г., Ягорычаў У., Мазур Т., Саласюк У.) – 28.11.

9. Творчая сустрэча пісьменнікаў В. Кудлачова і І. Фамянковай з вучнямі гімназіі №5 – 29.11;
10. Прэзентацыя новай кнігі Пятра Сямінскага “Калінавы цмок, або Казкі Нёманскіх хваляў” у філіяле бібліятэкі №10 (Д. Радзівончык, А. Апанасевіч,) – 30.11.
11. Выйшла кніга У. Ягорычава “”
12. Выйшла книга И. Фамянковай “Встречный ветер: повесть о Ядвиге Скоробогатой”.
13. Выйшла книга В. Кудлачова и И. Фамянковай “Советы мага Гантэлькина”.

**СНЕЖАНЬ**

1. Традыцыйныя снежаньския сустрэчы ў Гудзевіцкім літаратурна-краязнаўчым музеі. Былізапрошаны Л. Кебіч, Г. Скаржынская, Л. Шаўчэнка, М. Іваноўскі – 06.12;
2. На Прэзідыуме Саюза пісьменнікаў Беларусі прыняты ў Саюз Вікторыя Смолка і Рыгор Гармаш – 06.12;
3. Літаратурная вечарына ў Доме-музеі Максіма Багдановіча, прысвечаная 126-й гадавіне з дня народзін паэта (Л. Кебіч, Д. Радзівончык, А. Сабуць, Г. Скаржынская) – 07.12;
4. Чарговае пасяджэнне грамадскай літаратурнай школы па тэме ”Асновы вершаскладання і іх праблематыка ў творах сучасных беларускіх аўтараў” (вядучыя Л. Кебіч і Д. Радзівончык) – 13.12;
5. Сустрэча пісьменнікаў Л. Кебіч, Д. Радзівончыка і В. Смолкі з бібліятэкарамі вобласці. Тэма “Гродзеншчына літаратурная”. – 14.12;
6. Канцэрт духоўнай музыкі і паэзіі на пяці мовах у сацыяльным цэнтры Кастрычніцкага раёна, удзельнічалі паэты: Л. Кебіч, Р. Гармаш, С. Барнавалава, А. Шаламіцкая, В. Смолка, Д. Радзівончык. – 15.12;
7. Пасяджэнне дыскусійнага грамадскага клуба “Словадром”. Тэма: “Мой выхад” – 19.12;
8. Традыцыйная калядная вечарына паэзіі з удзелам прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў у Новым замку(Л. Кебіч, Р. Гармаш, Д. Радзівончык, В. Смолка, А. Шаламіцкая,) – 20.12;
9. Справаздачны сход аддзялення – 23.12.

З павагай Л.А. Кебіч